ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 35 (629) | Субота, 21 снежня 1985 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*З вечара працоўнай славы*

## ДАРОГІ РАМАНТЫКІ

Для студэнтаў нашай ВНУ гэтыя дарогі пачыналіся 22 гады назад з неасвоенай і неабжытай яшчэ казахстанскай цаліны. Ужо адышла ў гісторыю цалінная эпапея, але яна дала магутныя парасткі дрэву энтузіязму і рамантыкі неспакойнага студэнцкага племені, якое працягвае зелянець. З вуліцы, названай Мінскай, якую пабудавалі ў адным з пасёлкаў Уральскай вобласці 106 выхаванцаў Гомельскага педагагічнага інстытута імя В. П. Чкалава, пачаўся слаўны працоўны летапіс вядучай вышэйшай навучальнай установы беларускага Палесся.

Першы атрад камуністычнай працы, першыя атрады механізатараў, жывёлаводаў, медсясцёр... Усе яны ўзнікалі ўпершыню ў гісторыі СБА менавіта ў нашай ВНУ, што глыбока сімвалічна. Прыняўшы эстафету рамантыкі, выдатных спраў ад першацалiннікаў, ініцыятары ўсё новых і новых напрамкаў у студэнцкім патрыятычным руху на працягу вось ужо двух дзесяціголдзяў нясуць яе з гонарам! Аб гэтым сведчыць высокая ацэнка значных здабыткаў удзельнікаў студэнцкіх працоўных семестраў ГДУ — прысуджэнне яму Памятнага сцяга ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР за шматгадовы актыўны ўдзел у будаўніцтве і меліярацыі зямель, неаднаразовыя перамогі ў сацыялістычным спаборніцтве сярод зводных СБА ВНУ вобласці, рэспублікі.

Працоўны семестр—85, які праходзіў пад знакам 40-годдзя слаўнай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і дастойнай сустрэчы XXVII з'езда КПСС, не стаў выключэннем. Зноў атрымана працоўная перамога — байцамі зводнага атрада ГДУ асвоена звыш 900 тысяч рублёў капітальных укладанняў, за дні ўдарнай працы і за ганаровых байцоў у грамадскія фонды пералічана 26832 рублі.

Чарговы працоўны семестр вытрыманы студэнтамі універсітэта на «выдатна». Аб гэтым гаварылася на вечары працоўнай славы, які адбыўся ў мінулую суботу ў актавай зале ГДУ. Цёплыя словы ў адрас байцоў студэнцкіх атрадаў, якія выйшлі пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва, гучалі ў дакладзе намесніка сакратара камітэта камсамола універсітэта А. Шалдуковай, выступленні прарэктара па завочнаму навучанню Л. Н. Сечкі. Сваімі ўспамінамі аб ударнай працы байцоў дзяліліся камандзіры і камісары атрадаў розных напрамкаў: Ларыса Чуракова, Ірына Бусел, Наталля Мачульская. Аб незабыўных днях першага будатрада на цаліне расказаў былы яго камандзір, дацэнт кафедры эканомікі працы М. У. Акуліч. Высокую ацэнку рабоце зводнага СА ГДУ ў мінулым працоўным семестры даў у сваім выступленні на вечары камісар абласнога штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў І. Ф. Застанкевіч.

Як ніколі раней, стаў плённым працоўны семестр—85 для студэнтаў біялагічнага факультэта. Упершыню на біяфаку быў створаны камуністычны атрад імя А. С. Макаранкі, байцы якога працавалі ў Гомельскім доме дзіцяці, выйшлі пераможцамі сярод атрадаў універсітэта будаўнічага і небудаўнічага напрамкаў адпаведна СА «Памяць» і атрад імя Міхаіла Мароза. Факультэту прысуджана першае месца ва універсітэце па выніках працоўнага лета—85. Ва ўрачыстай абстаноўцы на вечары Л. Н. Сечка ўручыў пераходны Чырвоны сцяг ГДУ дэкану біяфака С. Ф. Алешку.

Дэкану эканамічнага факультэта У. Д. Арэшчанку былі ўручаны Ганаровая грамата і пераходны вымпел за другое месца, занятае эканомфакам у сацыялістычным спаборніцтве СА ГДУ. Ганаровай граматы і пераходнага вымпела ўдастоены таксама фізічны факультэт за 3-е месца. Іх прыняў намеснік дэкана фізфака І. В. Семчанка.

Ганаровыя граматы былі ўручаны камандзірам і камісарам атрадаў-пераможцаў: «Эканаміст», «Сірыус» (эканомфак), «Крышталь», «Волаты» (фізічны факультэт), «Памяць» і імя Міхаіла Мароза (біяфак).

Вялікая група актывістаў будатрадаўскага руху атрымала на вечары памятныя падарункі.

...Куды б ні прывялі дарогі рамантыкі байцоў студэнцкіх атрадаў ГДУ наступным летам, усюды юнакі і дзяўчаты змогуць паказаць у чарговы раз сваё працалюбства і майстэрства.

**Т. ДУБЯК.**



На здымку: група актывістаў студэнцкага патрыятычнага руху універсітэта (у першым радзе злева направа) Алена Пашукевіч, Таццяна Шапавалава — камісар і камандзір атрада імя Міхаіла Мароза біялагічнага факультэта, які заняў 3-е месца ва універсітэце сярод СА небудаўнічага напрамку; Алена Аўдашова — сакратар камсамольскага бюро біяфака, камісар макаранкаўскага атрада; у другім радзе: Юрый Тарасенка — камандзір атрада «Эканаміст»; Генадзь Кавалёў, Ігар Дзідкоўскі — адпаведна камандзір і баец атрада «Памяць» (біяфак), заняўшага 3-е месца ў ГДУ сярод СА будаўнічага напрамку; Віктар Шведаў — камандзір макаранкаўскага атрада, студэнт 5-га курса матэматычнага факультэта; Сяргей Фядосенка — камандзір Рэчыцкага занальнага штаба СБА, намеснік начальніка штаба працоўных спраў ГДУ, студэнт 3-га курса гістфіла.

Фота Н. Кір'янавай.

## СУСТРЭЧА С ЖУРНАЛІСТАМ

Праграма заняткаў аддзялення журналістыкі ФГП прадугледжвае як лекцыі і семінарскія заняткі, так і сустрэчы з вядучымі журналістамі рэспубліканскага і абласнога друку, тэлебачання і радыёвяшчання.

На чарговых занятках слухачоў гэтага аддзялення адбылася адна з такіх першых сустрэч. Госцем студэнтаў быў уласны карэспандэнт газеты «Советская Белоруссия» па Гомельскай вобласці Анатоль Іванавіч Гатоўчыц. Ён расказаў аб спецыфіцы работы журналіста, цікавых людзях, якія сталі героямі яго матэрыялаў.

Сустрэча дапамагла слухачам ФГП «зазірнуць» у творчую лабараторыю журналіста, даведацца шмат цікавага аб людзях, якія гатовы «трое суток шагать, трое суток не спать ради нескольких строчек в газете».

**Т. НІКАЛАЕВА.**

Абмяркоўваем перадз'ездаўскія партыйныя дакументы

## ПА-ДЗЕЛАВОМУ

Крыху больш двух месяцаў засталося да дня адкрыцця чарговага XXVII з'езда КПСС. На ім будуць прыняты дакументы велізарнага гістарычнага значэння. Іх праекты цяпер знаходзяцца ў цэнтры ўвагі камуністаў, усіх працоўных краіны. Ва ўсіх калектывах працягваецца іх ажыўленае, дзелавое абмеркаванне.

У партгрупах, на сходах партарганізацый структурных падраздзяленняў, агульнауніверсітэцкай канферэнцыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ было ўнесена шмат прапаноў, дапаўненняў і заўваг у праекты Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года, новай рэдакцыі Праграмы КПСС, Статута КПСС з прапаноўваемымі змяненнямі.

На біялагічным факультэце асаблівая ўвага ўдзялялася пытанням аховы навакольнага асяроддзя. Так, асістэнт кафедры заалогіі і аховы прыроды В. М. Верамееў прапанаваў у раздзеле XI Асноўных напрамкаў запісаць: **«Узмацніць адказнасць грамадзян за парушэнне правіл палявання і рыбалоўства. За парушэнне закона аб ахове прыроды і забруджванне навакольнага асяроддзя павысіць персанальную адказнасць кіруючых работнікаў».** Да гэтага ж раздзела сваё дапаўненне ўнесла і дацэнт названай кафедры І. Ф. Расашка. Яна лічыць неабходным **«узмацніць работу па экалагічнаму выхаванню ва ўсіх звеннях сярэдняй і вышэйшай адукацыі».**

Адна з галоўных мэт Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада ў бліжэйшай будучыні — забяспечыць усіх савецкіх людзей добраўпарадкаваным жыллём. Аднак, як выказвае сваё меркаванне кандыдат эканамічных навук А. І. Окрут з кафедры палітэканоміі, у сувязі са змяненнем саставу сем'яў маюць месца выпадкі выкарыстання жыллёвай плошчы звыш устаноўленых норм. Нярэдка яе здаюць у арэнду або выкарыстоўваюць не па прамому назначэнню. А. І. Окрут прапануе ў X раздзел Асноўных напрамкаў запісаць: **«Павялічыць будаўніцтва жылых дамоў па новых эканамічных тыпавых праектах з палепшанай планіроўкай кватэр. Упарадкаваць выкарыстанне грамадскага жыллёвага фонду ў адпаведнасці з устаноўленымі нарматывамі».**

## ШЫРОКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

На апошнім пасяджэнні кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства быў абмеркаваны праект Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года. Загадчык кафедры прафесар П. У. Сцяцко, дацэнты М. Ф. Гуліцкі, У. І. Коваль і аўтар гэтых радкоў падкрэслівалі ў сваіх выступленнях, што для эфектыўнага выканання тых вялікіх задач, якія ставіць перад намі Камуністычная партыя, першачарговае значэнне надаецца паляпшэнню арганізацыі навуковых даследаванняў, умацаванню дысцыпліны і адказнасці на ўсіх участках працоўнай і выхаваўчай дзейнасці кожнага з нас, усямернаму развіццю творчай ініцыятывы.

У праекце Асноўных напрамкаў падкрэсліваецца неабходнасць сувязі ВНУ з вядучымі навуковымі цэнтрамі краіны. На працягу апошніх гадоў калектыў нашай кафедры падтрымлівае разнастайныя формы супрацоўніцтва з вучонымі Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР. Так, на апошняй сустрэчы з загадчыкам сектара рускай мовы гэтага інстытута доктарам філалагічных навук А. М. Булыкам і старшым навуковым супрацоўнікам, вучоным сакратаром Тэрміналагічнай камісіі АН БССР кандыдатам філалагічных навук Л. А. Антанюк актыўна абмяркоўваліся планы сумесных навуковых даследаванняў на XII пяцігодку і на перыяд да 2000 года.

Кафедра плануе ў 1987 годзе выпуск у выдавецтве «Універсітэцкае», «Руска-беларускага слоўніка лінгвістычных тэрмінаў» (дапаможнік для настаўнікаў). У наступнай пяцігодцы кафедрай і Інстытутам мовазнаўства будуць падрыхтаваны «Дэрывацыйны руска-беларускі слоўнік», «Дыферэнцыяльны руска-беларускі слоўнік». Загадчык кафедры прафесар П. У. Сцяцко прымае ўдзел у падрыхтоўцы «Слоўніка мовы Якуба Коласа», у выданні «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы», у выпуску манаграфіі «Супастаўляльнае вывучэнне рускай і беларускай моў». На перыяд з 1986 года па 1990 гады запланавана абарона 7 кандыдацкіх дысертацый асістэнтамі А. І. Цімашэнка, Л. А. Клімковай, А. Ф. Рогалевым, А. В. Уласавым, І. І. Кобыш, В. А. Капыткам і аўтарам гэтых радкоў.

Дацэнт Л. Р. Яцкевіч падрыхтавала ўжо доктарскую дысертацыю, тэкст якой абмеркаваны на кафедры і прызнаны ў цэлым закончаным даследаваннем. Кафедра мае ўсе падставы лічыць магчымай абарону доктарскай дысертацыі дацэнтам Л. Р. Яцкевіч у XII пяцігодцы. У 1987—1988 г.г. плануецца выхад яе манаграфіі «Метады даследавання мовы».

Паспяховае вырашэнне ўсіх названых задач перспектыўнага развіцця кафедры ў бліжэйшай будучыні і на больш працяглы перыяд патрабуе поўнай самааддачы кожнага выкладчыка і супрацоўніка, высокай арганізаванасці і творчых намаганняў. На гэта нас нацэльваюць перадз'ездаўскія партыйныя дакументы.

**П. ЧАЙКУН,**
**асістэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.**

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, кафедра матэматычных праблем кіравання горача віншуюць старшага навуковага супрацоўніка НДЛ сістэмнага праграміравання **КАРАТКЕВІЧА Уладзіміра Апалонавіча** з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

